## Па тваіх, Ільіч, запаветах

# 1. ЗА ЎЛАДУ САВЕТАЎ



Калі знаёмішся са зместам калгаснай Кнігі Народнай Славы сельгасарцелі «Чырвоны маяк», у памяці паўстае жывая гісторыя. У жорсткіх бітвах прыходзілася нашым бацькам і дзедам адстойваць заваёвы Кастрычніка, разбурыўшы стары, струхнелы грамадскі лад. У цяжкіх умовах змагаліся яны з унутранымі і знешнімі ворагамі. Нярэдка даводзілася ўступаць у барацьбу з рознымі бандыцкімі шайкамі. Але перамога заўсёды была на баку змагароў за ўладу народа.

Вось, напрыклад, некалькі радкоў з біяграфіі двух былых конармейцаў Мікіты Сямёнавіча Аўчыннікава і Дзяніса Якаўлевіча Касцюшкіна. Запіс кароткі, але ў ім вельмі многа сказана, укладзены цэлы летапіс з жыцця абаронцаў маладой Савецкай рэспублікі.

### АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ

...Знамянальны 1917 год. Хваляванні сярод салдат царскай арміі ўзрасталі з кожным днём. Армейская дысцыпліна была настолькі расхістана, што нярэдка салдаты не выконвалі загадаў камандзіраў. У гэты час Мікіта Аўчыннікаў і Дзяніс Касцюшкін знаходзіліся ў гусарскім палку ў горадзе Белгарадзе. Тут яны сустрэлі Кастрычніцкую рэвалюцыю і канчаткова рашылі змагацца за Саветы. З праграмай бальшавікоў коннікі былі знаёмы з ліпеня 1917 года, калі ўпершыню прагаласавалі за партыю бальшавікоў у белгарадскай гімназіі. Цяпер былыя гусары ступілі на шлях станаўлення Савецкай улады. Мікіта Сямёнавіч працягваў службу ў запасным палку, абучаў коней і адпраўляў іх на фронт.

...Сакавік 1918 года. Кавалерыст Аўчыннікаў прымае ўдзел ва ўстанаўленні Савецкай улады ў Курскай губерні, летам удзельнічае ў падаўленні паўстання ў Баброўскім павеце Варонежскай губерні, якое арганізавалі белагвардзейцы, а з кастрычніка таго ж года — коннік дывізіі Будзённага, якая знаходзілася ў Маскве.

...Жнівень 1919 года. Служба пры школе малодшых камандзіраў на станцыі Гусіна паблізу горада Смаленска. Адсюль трапіў ў першы ўзорны кавалерыйскі дывізіён, якому прыйшлося вызваляць Мозыр і Калінкавічы ад банд Булак-Булаховіча. У баях за вызваленне гэтых гарадоў удзельнічаў і Дзяніс Якаўлевіч Касцюшкін.

У 1921 годзе закончыўся баявы шлях абаронцаў улады Саветаў. Яны прыступілі да мірнай стваральнай працы.

**І. Барысенка.**

**Барысенка, І.** За ўладу Саветаў / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка. — 1969. — 17 ліпеня.

*З біяграфіі двух былых конармейцаў Мікіты Сямёнавіча Аўчыннікава і Дзяніса Якаўлевіча Касцюшкіна.*